Дысцыпліна: **“Сучасная беларуская мова” (спец. “Беларуская філалогія”, 3 курс ФФ)**

Лекцыя па тэме: **Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка**

1. Словазлучэнне і сказ як асноўныя сінтаксічныя адзінкі.
2. Класіфікацыя словазлучэнняў.
3. Сродкі сінтаксічнай сувязі паміж кампанентамі ў словазлучэнні.

1. Словазлучэнне і сказ як асноўныя сінтаксічныя адзінкі. Словазлучэнне – гэта такое сэнсава-граматычнае аб’яднанне двух або некалькіх самастойных слоў у сказе, якія звязаны паміж сабою граматычна і па сэнсе і абазначаюць пэўныя паняцці. Зыходзячы з гэтага азначэння можна вылучыць асноўныя прыметы словазлучэння: кампаненты словазлучэння – самастойныя часціны мовы; адзін кампанент (залежнае слова) словазлучэння залежыць ад другога (галоўнае слова), прычым галоўнае слова мае асноўнае лексічнае значэнне, а залежнае яго канкрэтызуе.

Словазлучэнне валодае семантычнай цэласнасцю і граматычнай арганізаванасцю. Дзякуючы гэтаму словазлучэнне ў пэўнай меры суадносіцца са словам і сказам, але і адрозніваецца ад іх.

Разгледзім спачатку суадносіны словазлучэння і слова. 1. Як і многія словы, словазлучэнні – намінатыўны сродак мовы (называюць прадметы, з’явы і г.д.: *чырвоная сукенка*). 2. Словазлучэнні з’яўляюцца будаўнічым матэрыялам для сказаў. Адрозніваецца словазлучэнне ад слова колькасным складам кампанентаў.

Адрозненне словазлучэння ад сказа ў тым, што 1) сказ можа складацца з аднаго слова (*Ноч. Цішыня*); 2) словазлучэнне не мае сэнсава-граматычнай і інтанацыйнай завершанасці; 3) словазлучэнне не валодае катэгорыяй мадальнасці; 4) словазлучэнне не выражае закончанай думкі. Сказ жа характарызуецца наступнымі асаблівасцямі:

– камунікатыўнасцю;
– прэдыкатыўнасцю;
– мадальнасцю;
– тэмпаральнасцю (дзеянне ў адным часе);
– інтанацыйнасцю.

Такім чынам, сказ – камунікатыўная прэдыкатыўная сінтаксічная адзінка, а словазлучэнне – намінатыўная непрэдыкатыўная сінтаксічная адзінка.

Словазлучэнне неабходна адрозніваць ад іншых спалучэнняў слоў. Не з’яўляюцца словазлучэннямі:

1) спалучэнне дзейніка і выказніка: *свеціць сонейка*;
2) аднародныя члены сказа (у вузкім сэнсе): *дарослыя і дзеці*;
3) складаныя формы будучага часу: *будзе пісаць*;
4) складаныя формы загаднага ладу дзеяслова: *давайце напішам*;
5) складаныя формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання прыметнікаў і прыслоўяў: *больш смелы, менш упэўнена*;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6) спалучэнне прыназоўніка з назоўнікам: *на праця́гу лета*;
7) састаўныя лічэбнікі: *трыста сорак пяць*;
8) састаўныя злучнікі: *для таго каб*;
9) спалучэнне аднаго і таго ж назоўніка ў розных склонавых формах з прыназоўнікам і без яго: *дурань дурнем, месяц за месяцам*;
10) спалучэнне слова і адасобленага члена сказа, які адносіцца да гэтага слова – гэта так званая паўпрэдыкатыўная сувязь: *зямля, пакрытая снегам*.

У лінгвістычнай літаратуры існуе шырокае і вузкае разуменне словазлучэння. Пры шырокім разуменні да словазлучэння адносяць аб'яднанне двух самастойных слоў у сказе, якія звязаны паратаксічнай (злучальнай) і гіпатаксічнай (падпарадкавальнай) сувяззю (В.П. Сухоцін, В.А. Белашапкава, А.М. Гвоздзеў). В.П. Сухоцін сюды ж адносіць і прэдыкатыўныя словазлучэнні. Пры вузкім разуменні словазлучэнняў да іх адносяць толькі аб'яднанні двух самастойных слоў у сказе, якія звязаны гіпатаксічна. Гэтай думкі прытрымліваюцца Н.Ю. Шведава, А.І. Наркевіч, В.У. Вінаградаў.

1. Класіфікацыя словазлучэнняў. Паводле структуры словазлучэнні падзяляюцца на простыя і складаныя.

Простыя словазлучэнні ўключаюць у свой склад два самастойныя словы: *блакітнае неба*. Да простых словазлучэнняў адносяць і такія словазлучэнні, у якіх залежны кампанент выражаны: 1) складанай назвай: *наведаць Далёкі Усход*; 2) сінтаксічна непадзельным спалучэннем або аналітычнай (складанай) граматычнай формай: *спаць трывожным сном*, *студэнт трэцяга курса, самае высокае дрэва*. У такіх словазлучэннях залежны кампанент выконвае функцыю аднаго члена сказа. Сустракаюцца выпадкі, калі ў простым словазлучэнні не залежны, а галоўны кампанент выражаны сінтаксічна непадзельным спалучэннем або аналітычнай граматычнай формай: *прыняць удзел у дыскусіі, будзем пісаць пераказ*.

Складаныя словазлучэнні – гэта тыя, што складаюцца з трох і больш самастойных слоў. Яны ўтвараюцца:

1) шляхам далучэння да залежнага слова аднаго або некалькіх паясняльных слоў: *успамінаць наша свята*;

2) шляхам далучэння да галоўнага слова аднаго або некалькіх паясняльных слоў: *з задавальненнем успамінаць свята*;

3) шляхам далучэння да галоўнага і залежнага кампанентаў аднаго або некалькіх самастойных слоў: *з задавальненнем успамінаць наша свята*.

Паводле сэнсавай спаянасці кампанентаў словазлучэнні падзяляюцца на свабодныя і несвабодныя.

У свабодных словазлучэннях словы захоўваюць сваю сэнсавую самастойнасць і могуць свабодна ўступаць у сінтаксічныя адносіны з іншымі словамі. Свабодныя словазлучэнні абазначаюць расчлянёныя паняцці. Кожнае слова, што ўваходзіць у такія словазлучэнні, мае свае асобныя функцыі ў сказе: *зялёныя дрэвы, драўляная падлога*.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Несвабодныя словазлучэнні страцілі сэнсавыя і граматычныя адносіны паміж словамі і ўжываюцца для абазначэння аднаго нерасчлянёнага паняцця. Пэўнае слова такіх словазлучэнняў, як правіла, мае пераносны сэнс, а таму не можа свабодна ўступаць у спалучэнні з іншымі словамі: *палярны круг, набіць руку*. У сказе такія словазлучэнні выконваюць ролю аднаго члена сказа.

Неабходна размяжоўваць сінтаксічна несвабодныя (*дзяўчынка **з блакітнымі вачамі**, чалавек **сталага ўзросту***) і фразеалагічна несвабодныя словазлучэнні (*своечасова **даць лататы***).

Паводле сінтаксічнай сувязі словазлучэнні падзяляюцца на прэдыкатыўныя і непрэдыкатыўныя. Прэдыкатыўныя словазлучэнні – спалучэнне дзейніка і выказніка. Непрэдыкатыўныя словазлучэнні звязваюцца пры дапамозе гіпатаксічнай і паратаксічнай сувязі.

Гіпатаксічная сувязь – гэта аб'яднанне двух граматычна нераўнапраўных слоў, з якіх адно залежыць ад другога. Паратаксічная сувязь характэрна для граматычна раўнапраўных слоў.

Разнавіднасці паратаксічнай (злучальнай) сувязі:

З'яднанне – такі від сінтаксічнай паратаксічнай сувязі, пры якім раўнапраўныя словы спалучаюцца паміж сабой: *залікі і экзамены, хлопчык і лётчык*.

Раз'яднанне – такі від сінтаксічнай паратаксічнай сувязі, пры якім раўнапраўныя словы супастаўляюцца паміж сабой: *малады, але хілы*.

Перараз'яднанне – такі від сінтаксічнай паратаксічнай сувязі, пры якім раўнапраўныя словы чаргуюцца або ўзаемна выключаюць адно другое: *ці вясной, ці летам; ці экзамен, ці залік*.

Разнавіднасці гіпатаксічнай (падпарадкавальнай) сувязі:

Дапасаванне – такі від сінтаксічнай гіпатаксічнай сувязі, пры якім формы залежнага слова прыпадабняюцца да граматычных форм галоўнага слова (часцей за ўсё гэта прыметнікі, дзеепрыметнікі, азначальныя займеннікі, парадкавыя лічэбнікі + назоўнік). Дапасаванне можа быць поўным і няпоўным. Поўным дапасаванне з'яўляецца тады, калі залежнае слова прымае ўсе формы галоўнага: *разгорнутая кніга, першая сустрэча*. Няпоўным дапасаванне з'яўляецца тады, калі залежнае слова набывае не ўсе ўласцівыя яму граматычныя формы ў адпаведнасці з формамі галоўнага слова: *наша доктар, рака Сож, вёска Навасёлкі*.

Кіраванне – такі від сінтаксічнай гіпатаксічнай сувязі, пры якім галоўнае слова патрабуе ад залежнага формы пэўнага ўскоснага склону: *напісаць пісьмо, сустрэцца ў тэатры*. Галоўнае слова можа кіраваць залежным пры дапамозе прыназоўнікаў і без іх. Пагэтаму вылучаюць прыназоўнікавае і беспрыназоўнікавае кіраванне: *займалася па вечарах, атрымаць пісьмо*. Кіраванне можа быць моцным і сла́бым. Моцным кіраванне з'яўляецца тады, калі кіруючае (галоўнае) слова абавязкова патрабуе пэўнай формы залежнага слова: *чытаць кнігу*. Слабым кіраванне з'яўляецца тады, калі форма залежнага слова не абумоўлена прыродай кіруючага слова: *чытаць брату*.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прымыканне – такі від сінтаксічнай гіпатаксічнай сувязі, пры якім залежнае слова звязваецца з галоўным па сэнсе і інтанацыйна. Як правіла, прымыкаюць нязменныя часціны мовы: прыслоўі, дзеепрыслоўі, інфінітыў: *ісці хутка, размова па-беларуску, гаварыць не спыняючыся*. Акрамя таго, прымыкаюць так званыя нескланяльныя прыметнікі (*паліто хакі, праграма мінімум*) і нязменныя прыналежныя займеннікі *яго*, *яе*, *іх* (*яго дом, яго кватэра, яго дзеці*). Неабходна заўважыць, што нескланяльныя назоўнікі не прымыкаюць, а кіруюцца, да іх можна паставіць склонавае пытанне; яны могуць мець пры сабе прыназоўнікі: *слухала радыё, ехаць у таксі*.

Паводле выражэння галоўнага слова словазлучэнні падзяляюцца на іменныя (назоўнікавыя, прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя), дзеяслоўныя і прыслоўныя. *Дапамога студэнтам* – назоўнікавае, *здольны да вучобы* – прыметнікавае, *трэці ад краю* – лічэбнікавае, *што-небудзь прыемнае* – займеннікавае, *ісці лесам* – дзеяслоўнае, *разам з сябрамі* – прыслоўнае.

Сярод сэнсавых адносін паміж кампанентамі ў словазлучэнні вылучаюць наступныя:

1) атрыбутыўныя (азначальныя) адносіны: *трэці дзень, дзіцячы часопіс*;

2) адносіны прыналежнасці: *кніга брата, сукенка маці*;

3) аб'ектныя адносіны: *чытаць кнігу, развітацца з сябрам, чытанне паэмы*;

4) суб'ектныя адносіны (адносіны паміж дзеяннем і яго ўтваральнікам): *спяваецца артыстамі, выкананне студэнтамі*;

5) акалічнасныя адносіны з іх разнавіднасцямі:

-часавыя: *з'явілася пад раніцу, спыніцца праз дзесяць хвілін*;

-прычынныя: *пабялеў ад марозу, захварэць з гора*;

-мэты: *ехаць па справах, прыехалі дапамагаць капаць бульбу*;

-спосабу дзеяння: *прыгравала па-веснавóму, адказваць з неахвотай*;

-меры і ступені: *занадта смелы, удвая прыгажэйшы*;

-прасторавыя адносіны: *ісці па лесе, паказаўся з-за вугла*.

Акрамя таго, сярод сэнсавых адносін паміж кампанентамі ў словазлучэннях сустракаюцца адносіны сумеснаці: *брат з сястрой*; адносіны колькасці: *дзве сястры*; абагульняльныя адносіны: *кожны з дзяцей*; вылучальныя адносіны: *нехта са студэнтаў*; адносіны прызначэння: *фарба для сцен* і інш. адносіны.

У словазлучэннях можа назірацца сінкрэтызм сэнсавых адносін: азначальныя з адценнем месца (*поле каля лесу*), азначальныя з адценнем прызначэння (*туш для павек*).

2. Сродкі сінтаксічнай сувязі паміж кампанентамі ў словазлучэнні.

Канчаткі. Яны з'яўляюцца фармальным паказчыкам адносін залежнага слова ад галоўнага: *чыстае неба, наш універсітэт*.

Прыназоўнікі, якія служаць сродкам кіравання ўскоснымі склонамі назоўнікаў, прадметных і асабовых займеннікаў, субстантываваных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыметнікаў і дзеепрыметнікаў. З іх дапамогай канкрэтызуюцца і дыферэнцуюцца значэнні ўскосных склонаў: *вострый на язык*.

Злучнікі. Яны служаць для сувязі слоў у паратаксічных словазлучэннях: *цёплы і ціхі, сонечны, але халодны*.

Парадак слоў. *Надвор'е цёплае*. – прэдыкатыўнае; *Цёплае надвор'е* – непрэдыкатыўнае.

Інтанацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ